# Палажэнне аб конкурсах праектных прапаноў ад праграмы Belarus Beehive 2.0:

*падтрымка грамадзянскай супольнасці як ключавога рухавіка дэмакратычных змен у Беларусі*

## Змест

**Уводзіны**
1.1. Кантэкст
1.2. Мэты конкурсу праектных прапаноў

**Лот 1.** Праектная падтрымка АГС
**Лот 2.** Падтрымка арганізацыйнага развіцця і інстытуцыйная падтрымка АГС
**Лот 3.** Падтрымка кааліцый АГС, сектаральных палітычных устаноў і сетак

1.3. Бяспека
1.4. Памер грантаў
1.5. Тэрміны конкурсаў і дэдлайны
1.6. Тэрміны бягучага адкрытага конкурсу

**2. Крытэрыі прымальнасці конкурсу прапаноў**
2.1. Крытэрыі прымальнасці
2.1.1. Крытэрыі прымальнасці да заяўнікаў
2.1.2. Крытэрыі прымальнасці да відаў дзейнасці (прыярытэты для Лота 1 і віды дзейнасці для Лотаў 2, 3)
2.1.3. Крытэрыі прымальнасці выдаткаў
2.2. Колькасць заявак і грантаў на заяўніка

**3. Бачнасць праекта**

**4. Этычныя палажэнні і Кодэкс паводзін**

**5. Працэс падачы заяўкі і працэдуры**
5.1. Праектныя прапановы
5.2. Як адпраўляць праектныя прапановы

5.3. Адбор праектных прапаноў
5.3.1. Крок 1: Адміністрацыйная праверка
5.3.2. Крок 2: Ацэнка праектнай прапановы
5.3.3. Крок 3: Пасяджэнне Адборачнай камісіі
5.3.4. Крок 4: Паведамленне пра рашэнне Адборачнай камісіі
5.3.5. Крок 5: Праверка прымальнасці заяўнікаў для заключэння кантракта

**6. Падрыхтоўка да заключэння кантракта**

**7. Спіс дадаткаў**

**8. Ацэнка (дыягностыка) арганізацыйнага патэнцыялу (АГС)**

*** Corrigendum No 1 да п. 1.6**

# УВОДЗІНЫ

## 1.1. КАНТЭКСТ

Конкурс праектных прапаноў абвяшчаецца ў межах праграмы «Belarus Beehive 2.0: падтрымка грамадзянскай супольнасці як ключавога рухавіка дэмакратычных змен у Беларусі».

Агульнай мэтай праграмы з'яўляецца рэарганізацыя і ўзмацненне беларускай грамадзянскай супольнасці ва ўмовах турбулентнасці і палітычных змен.

Падача праектных прапаноў у конкурсе ажыццяўляецца праз вэб-аплікацыю.

## 1.2. МЭТЫ КОНКУРСУ ПРАЕКТНЫХ ПРАПАНОЎ

Асноўнай мэтай гэтага конкурсу праектных прапаноў з'яўляецца развіццё сталай грамадзянскай супольнасці як актара дэмакратычных змен Беларусі.

*Конкурс праектных прапаноў падзелены на 3 лоты:*

## ЛОТ 1. ПАДТРЫМКА ПРАЕКТАЎ АГС

**Мэта Лота 1:** падтрымаць беларускія АГС і грамадзянскія ініцыятывы ў аказанні паслуг сваім мэтавым групам або ў распрацоўцы і рэалізацыі інавацыйных праектаў для адказу на сучасныя выклікі.

***Чаканыя вынікі для праектаў АГС, якія знаходзяцца ў Беларусі:***

– павышэнне ўстойлівасці грамадзянскай супольнасці;
– захаванне дзейных і з'яўленне новых ініцыятыў і нефармальных груп;

– з’яўленне здольнасцяў працаваць з актуальнымі грамадскімі праблемамі і вырашаць іх;
– з’яўленне здольнасцяў планаваць і рэалізоўваць змены і інавацыйныя рашэнні;
– захаванне і развіццё сацыяльных/грамадзянскіх сувязяў паміж людзьмі ў краіне;
– магчымасць аказання паслуг для мэтавых аўдыторый.

***Чаканыя вынікі для праектаў АГС, якія знаходзяцца па-за межамі Беларусі:***

– узмацненне патэнцыялу АГС, дзейнасць якіх накіравана на дасягненне дэмакратычных змен у Беларусі;
– вырашэнне праблем і выклікаў, з якімі сутыкаюцца мэтавыя групы АГС;
– распрацоўка інавацыйных рашэнняў для аказання дапамогі мэтавым групам у Беларусі, паляпшэння якасці паслуг, запатрабаваных вялікай колькасцю беларусаў у Беларусі і па-за яе межамі;
– аказанне дапамогі грамадзянскай супольнасці ў Беларусі;
– змена стаўлення зацікаўленых бакоў да пэўных праблем праз адвакацыю, распрацоўка і прапанова стратэгій і палітык для гэтага;
– павышэнне дасведчанасці мэтавых груп у грамадскім і палітычным пытаннях, змена паводзін і адносін мэтавых груп на больш дэмакратычныя і канструктыўныя.

***Лот 1 таксама прадугледжвае дадатковы прыярытэт, скіраваны на распрацоўку адукацыйных матэрыялаў і анлайн-кантэнту для грамадзянскай адукацыі****. У рамках гэтага прыярытэту магчыма стварэнне інтэрактыўных курсаў, падручнікаў, відэакантэнту, падкастаў і іншых фарматаў навучання, адаптаваных да патрэб розных мэтавых аўдыторый, з асаблівым акцэнтам на выкарыстанне беларускай мовы.*

**Belarus Beehive 2.0 не падтрымлівае:**

1. Акадэмічных праектаў (акрамя стварэння матэрыялаў для грамадзянскай адукацыі);
2. Праектаў мабільнасці;
3. Праектаў, мэтамі якіх з’яўляецца стварэнне ці прасоўванне медыяпрадуктаў;
4. Праектаў, мэтамі якіх з’яўляецца стварэнне твораў культуры і мастацтва;
5. Праектаў, якія не маюць выразнага сацыяльнага ці грамадскага ўплыву.

*Прыярытэты Лота 1 могуць карэктавацца арганізатарамі конкурсу ў кожным наступным конкурсе ў адпаведнасці з вынікамі даследаванняў, штогадовымі ацэнкамі патрэб, аналізам папярэдніх конкурсаў прапаноў, вынікамі кансультацый з зацікаўленымі бакамі.*

## ЛОТ 2. ПАДТРЫМКА АРГАНІЗАЦЫЙНАГА РАЗВІЦЦЯ І ІНСТЫТУЦЫЙНАЯ ПАДТРЫМКА АГС

**Мэта Лота 2:** даць магчымасць беларускім АГС быць устойлівымі і моцнымі агентамі перамен у/для Беларусі або/і надзейнымі партнёрамі для іншых зацікаўленых бакоў
і донараў, падтрымліваць і ўмацоўваць тых, хто можа быць рухавіком дэмакратычных змен у Беларусі.

*Чаканыя вынікі* ***для АГС у Беларусі:***

– павышэнне ўстойлівасці і жыццяздольнасці груп грамадзянскай супольнасці, захаванне і развіццё іх сувязяў з АГС за мяжой;
– падвышэнне здольнасцяў працаваць з актуальнымі грамадскімі праблемамі, планаваць і рэалізоўваць змены і інавацыйныя рашэнні.

*Чаканыя вынікі* ***для АГС па-за межамі Беларусі:***

– павышэнне ўстойлівасці АГС, дзейнасць якіх накіравана на дэмакратычныя змены ў Беларусі, пашырэнне іх грамадскай падтрымкі, развіццё сувязяў з мэтавымі групамі і групамі грамадзянскай супольнасці ў Беларусі;
– з’яўленне здольнасцяў вырашаць актуальныя праблемы беларускага грамадства, планаваць і рэалізоўваць змены і інавацыйныя рашэнні, асабліва для працы ў трансмежным фармаце;
– пашырэнне патэнцыялу для стварэння сетак, сектаральнай і міжсектаральнай супрацы і стварэння кааліцый, дыверсіфікацыі фінансавых крыніц і росту колькасці сябраў;
– удасканаленне ўнутраных працэдур, павышэнне кваліфікацыі персаналу, павышэнне пазнавальнасці арганізацыі, пашырэнне кола валанцёраў і спажыўцоў іх паслуг.

***Прапановы, якія не накіраваны на дасягненне гэтых вынікаў, не будуць падтрыманы ў межах конкурсу.***

*Для таго, каб мець магчымасць падаць праектную прапанову на гэты лот, арганізацыя мусіць папярэдне прайсці Ацэнку (дыягностыку) арганізацыйнага патэнцыялу, зробленую незалежным экспертам. Такая ацэнка можа быць зроблена вашай арганізацыяй паводле ўласнай замовы, а таксама запытана ў праграмы Belarus Beehive (гл. Раздзел 8 гэтага Палажэння).*

## ЛОТ 3. ПАДТРЫМКА КААЛІЦЫЙ АГС, СЕКТАРАЛЬНЫХ ПАЛІТЫЧНЫХ УСТАНОЎ І СЕТАК

**Мэта Лота 3:** умацаванне дзейных кааліцый АГС, сетак і інстытутаў сектаральнай палітыкі, і ў прыватнасці, беларускіх імплементарыяў міжнароднай дапамогі, а таксама дапамога дзейным кааліцыям АГС, сеткам і галіновым інстытутам у рэалізацыі іх планаў развіцця і навыкаў адвакацыі грамадскіх інтарэсаў.

***Чаканыя вынікі:***

– бачная супраца і супольныя дзеянні на карысць Беларусі, устойлівасць і прызнанне ад зацікаўленых бакоў і мэтавых груп, змяненне стаўлення зацікаўленых бакоў да пэўных праблем праз адвакацыю і выпрацоўку сектаральных палітык і стратэгій;
– умацаванне грамадскай падтрымкі дзейных кааліцый АГС, сетак і інстытутаў сектаральнай палітыкі, то-бок прызнанне іх ролі з боку зацікаўленых бакоў, мэтавых груп і саміх чальцоў кааліцый;
– падтрымка і развіццё сувязяў дзейных кааліцый АГС, сетак і інстытутаў сектаральнай палітыкі з групамі грамадзянскай супольнасці ў Беларусі;
– здольнасць планаваць і ажыццяўляць грамадскія змены, быць заканадаўцамі трэндаў для іх тэматычнага сектара і дэманстраваць мадэлі і найлепшыя практыкі для пераймання дэмакратычнай арганізацыйнай культуры;
– дастатковы патэнцыял для аказання аператыўнай падтрымкі іншым удзельнікам грамадзянскай супольнасці, добра развітыя ўнутраныя працэдуры.

*Для таго, каб мець права падаць праектную прапанову на гэты лот, кааліцыя АГС, сетка ці інстытут сектаральнай палітыкі мусяць папярэдне прайсці Ацэнку (дыягностыку) арганізацыйнага патэнцыялу, зробленую незалежным экспертам. Такая ацэнка можа быць зроблена вашай арганізацыяй паводле ўласнай замовы, а таксама запытана ў праграмы Belarus Beehive (гл. Раздзел 8 гэтага Палажэння).*

## 1.3. БЯСПЕКА

Для бяспечнай працы з вэб-аплікацыяй Beesystem і захавання канфідэнцыйнасці інфармацыі важна прытрымлівацца наступных правілаў:

1. **Выдача і выкарыстанне спецыяльнага электроннага адрасу.**
   Пасля запыту доступу праз форму, кожнаму заяўніку прадастаўляецца індывідуальная электронная пошта на абароненым сэрвісе Gmail. Выкарыстоўвайце толькі гэты акаўнт для працы з вэб-аплікацыяй і камунікацыяй з прадстаўнікамі праграмы.

2. **Доступ толькі з камп’ютараў.**
   Рэгістрацыя і праца з праектнымі прапановамі павінна ажыццяўляцца **выключна** з камп’ютарных прыладаў.

3. **Рэжым інкогніта ў браўзеры.**
   Адкрывайце вэб-аплікацыю Beesystem толькі ў рэжыме інкогніта вашага браўзера. Гэта дапаможа мінімізаваць захоўванне кэш-даных і аўтаматычны запіс уліковых дадзеных.

4. **Абавязковае выкарыстанне VPN.**
   Калі вы знаходзіцеся ў Беларусі або частка вашай каманды працуе ўнутры краіны, падключэнне праз VPN з’яўляецца **абавязковай умовай.**

5. **Захаванне дадзеных.**
   Пераканайцеся, што вы не захоўваеце паролі або іншыя ўліковыя дадзеныя на агульнадаступных прыладах.

## 1.4. ПАМЕР ГРАНТАЎ

Бюджэт праектнай прапановы ў межах гэтага конкурсу прапаноў мусіць знаходзіцца паміж наступнымі мінімальнымі і максімальнымі сумамі:

**Лот 1**

- Максімальная сума, якая вылучаецца на грант: 60 000 еўра.
- Мінімальны памер гранта: 5 000 еўра.
- Сярэдні рэкамендаваны памер гранта: 40 000 еўра.

Максімальная сума для **Прыярытэта 4 у Лоце 1:** да 15 000 еўра для асобнага курса ці матэрыялу.

**Лот 2**

- Максімальная сума, якая вылучаецца на грант: 40 000 еўра.
- Мінімальны памер гранта: 5000 еўра.
- Сярэдні рэкамендаваны памер гранта: 30 000 еўра.

**Лот 3**

- Максімальная сума, якая вылучаецца на грант: 60 000 еўра.
- Мінімальны памер гранта: 5000 еўра.
- Сярэдні чаканы памер гранта: 55 000 еўра.

*Памер гранта ва ўсіх лотах пакрывае ўсе 100 % выдаткаў праекта.*

## 1.5. ТЭРМІНЫ КОНКУРСАЎ І ДЭДЛАЙНЫ

| Лот 1 (толькі 4 прыярытэт) | Лот 2 | Лот 3 |
|---|---|---|
| 16 мая 2025 г. | 16 мая 2025 г. | 16 мая 2025 г. |

Гэты арыенціровачны графік можа быць абноўлены праграмай Belarus Beehive. Абноўлены расклад будзе апублікаваны на сайце праекта www.belarusbeehive.eu

Для ўсіх лотаў праектныя прапановы прымаюцца да 23:59 (час паводле Мінска, Беларусь UTC/GMT +3:00) у адпаведнасці з правіламі, выкладзенымі ў гэтым Палажэнні.

## 1.6. ТЭРМІНЫ БЯГУЧАГА АДКРЫТАГА КОНКУРСУ (* гл. Corrigendum No 1 да п. 1.6)

0. Абвяшчэнне конкурсу праектных прапаноў: **11 красавіка 2025 г.**

1. Апошні тэрмін звароту па тлумачэнні ад каманды Belarus Beehive: **5 мая 2025 г.**

2. Апошні тэрмін выдачы ўдакладненняў і адказаў на пытанні камандай Belarus Beehive: **9 мая 2025 г.**

3. Апошні тэрмін падачы заявак Лотаў 1(4 прыярытэт), 2, 3: **16 мая 2025 г.**
Час: 23:59 паводле Мінска, Беларусь UTC/GMT +3:00.

4. Інфармацыя для заяўнікаў пра вынікі адміністрацыйнай праверкі:
у межах 2 тыдняў ад даты атрымання заяўкі.

6. Паведамленне пра вынікі разгляду праектных прапаноў:
у межах 45 дзён з даты атрымання заяўкі.

7. Падрыхтоўка і падпісанне кантрактаў: *ліпень – жнівень 2025 г.*

*Тэрміны разгляду заявак і падрыхтоўкі кантрактаў могуць быць падоўжаны ў залежнасці ад колькасці атрыманых заявак і іншых фактараў. У такіх выпадках усім заяўнікам гэта будзе паведамлена асабіста праз электронную пошту.*

## 2. КРЫТЭРЫІ ПРЫМАЛЬНАСЦІ КОНКУРСУ ПРАПАНОЎ

Гэтыя прынцыпы вызначаюць правілы падачы, адбору і рэалізацыі праектаў, якія фінансуюцца ў рамках гэтага конкурсу прапаноў.

### 2.1. КРЫТЭРЫІ ПРЫМАЛЬНАСЦІ

Ёсць тры наборы крытэрыяў прымальнасці, звязаных з:

*(1) заяўнікам, г. зн. юрыдычнай або фізічнай асобай, якая падае форму заяўкі;*

*(2) відамі дзейнасці, на якія можа быць вылучаны грант;*

*(3) формамі фінансавання і відамі выдаткаў, якія могуць быць улічаны пры вызначэнні памеру гранта.*

#### 2.1.1. КРЫТЭРЫІ ПРЫМАЛЬНАСЦІ ДА ЗАЯЎНІКАЎ

Каб прэтэндаваць на грантавую падтрымку, заяўнік мусіць адпавядаць наступным крытэрыям:

**Для Лота 1:**

а) Быць **арганізацыяй грамадзянскай супольнасці, якая працуе ўнутры Беларусі**,
незалежна ад наяўнасці афіцыйнай рэгістрацыі ці арганізацыйна-прававой формы.

Пры адсутнасці рэгістрацыі важна, каб прапанова падавалася адказнымі фізічнымі асобамі ад імя сталай ініцыятыўнай групы.

*Або:*

б) Быць **беларускай арганізацыяй грамадзянскай супольнасці, зарэгістраванай беларусамі па-за межамі Беларусі** ў адной з краін ЕС, Усходняга партнёрства
(як Грузія) або Еўрапейскай эканамічнай зоны, якая стала працуе з мэтавымі групамі ўнутры Беларусі.

Акрамя таго, праграма Belarus Beehive прымае **праектныя прапановы ад імя партнёрстваў** паміж зарэгістраванымі па-за межамі Беларусі беларускімі арганізацыямі і незарэгістраванымі групамі ўнутры Беларусі.

**Для Лота 2:**

а) Быць **арганізацыяй грамадзянскай супольнасці ў Беларусі,** нефармальнай групай без статусу юрыдычнай асобы, прадстаўленай фізічнымі асобамі ў Беларусі ці за мяжой, якія дзейнічаюць ад імя арганізацыі/ініцыятывы грамадзянскай супольнасці ў Беларусі.

*Або:*

б) Быць **беларускай арганізацыяй грамадзянскай супольнасці, зарэгістраванай беларусамі па-за межамі Беларусі** ў адной з краін ЕС, Усходняга партнёрства
(як Грузія) або Еўрапейскай эканамічнай зоны, якая стала працуе з мэтавымі групамі ўнутры Беларусі.

**Для Лота 3:**

Быць дзейнай кааліцыяй грамадзянскай супольнасці, установай сектаральнай палітыкі ці сеткай, якая сістэматычна працуе з сектаральнай палітыкай, мае мэты ў гэтай галіне, лабіруе і арганізоўвае вакол такіх пытанняў іншых дзеячаў беларускай грамадзянскай супольнасці, каардынуе з імі, а таксама з іншымі зацікаўленымі бакамі і донарамі, распрацоўку супольных дарожных карт або праграм (планаў) дзеянняў.

У прыватнасці, мы шукаем заяўнікаў, якія пачалі або плануюць запусціць кампанент фінансавай дапамогі трэцім асобам у пэўнай тэматычнай галіне, а таксама тых, хто пачынае заключаць *Output Based Contracts (кантракты на аснове вынікаў)* для сваіх бенефіцыярыяў у Беларусі.

**Заяўнік можа дзейнічаць асобна або з партнёрамі**.

У выпадку заключэння кантракта на грант галоўны заяўнік стане грантаатрымальнікам і галоўным каардынатарам гранта. Ён дзейнічае ад імя сваёй арганізацыі і сузаяўніка (партнёра), калі такі ёсць, і цалкам каардынуе рэалізацыю праекта.

Сузаяўнікі (партнёры) удзельнічаюць у распрацоўцы і рэалізацыі праекта, і выдаткі, якія яны нясуць, прымаюцца гэтак жа, як і выдаткі, панесеныя асноўным заяўнікам.

Сузаяўнікі мусяць адпавядаць патрабаванням, якія прымяняюцца да самога асноўнага заяўніка.

Сузаяўнікі мусяць падпісаць Мандат сузаяўніка (Дадатак B).

У выпадку заключэння кантракта на грант сузаяўнік(-і) стане(-уць) атрымальнікам(-і) праекта (разам з заяўнікам).

Акрамя таго, заяўнікі, сузаяўнікі і, у выпадку юрыдычных асоб, асобы, якія маюць правы прадстаўніцтва, прыняцця рашэнняў або кантролю гэтай юрыдычнай асобы, не могуць знаходзіцца ні ў адной з сітуацый, якія з'яўляюцца падставамі для выключэння яго з конкурсу.

*Гэта такія сітуацыі, калі:*

а) заяўнік ці сузаяўнік з'яўляецца банкрутам, знаходзіцца ў працэдуры неплацежаздольнасці або ліквідацыі;

б) канчатковым судом або канчатковым адміністрацыйным рашэннем было ўстаноўлена, што арганізацыя-заяўнік або сузаяўнік парушае свае абавязацельствы ў выплаце падаткаў або ўзносаў на сацыяльнае забеспячэнне ў адпаведнасці
з дзейным заканадаўствам;

в) канчатковым судом або канчатковым адміністрацыйным рашэннем было ўстаноўлена, што заяўнік ці асоба, якая яго прадстаўляе, вінаватыя ў сур'ёзных

прафесійных парушэннях у выніку парушэння дзейных законаў, або правіл, або этычных нормаў прафесіі;

г) прысудам, які ўступае ў сілу, было ўстаноўлена, што заяўнікі, сузаяўнікі і, у выпадку юрыдычных асоб, асобы, якія маюць правы прадстаўніцтва, прыняцця рашэнняў
або кантролю гэтай юрыдычнай асобы, вінаватыя ў любым з наступнага: махлярства; карупцыя; паводзіны, звязаныя са злачыннай арганізацыяй, дзіцячай працай

або іншымі формамі гандлю людзьмі; адмыванне грошай; злачынствы, звязаныя з тэрарыстычнай дзейнасцю, як гэта вызначана ў артыкулах 1 і 3 Рамачнага рашэння Еўрапейскага Савета ад 13 чэрвеня 2002 г. аб барацьбе з тэрарызмам, адпаведна, або падбухторванне, дапамаганне ці спроба здзейсніць такія злачынствы, як гаворыцца ў артыкуле 4 гэтага Рамачнага рашэння;

д) заяўнік ці сузаяўнік паказаў значныя недахопы ў выкананні асноўных абавязацельстваў пры выкананні кантракта, які фінансуецца Еўрапейскім Саюзам, што было выяўлена ў выніку аўдытаў або расследаванняў упаўнаважанага супрацоўніка, OLAF або Падліковай палаты ЕС;

е) знаходзіцца ў спісе санкцый.

*У Дэкларацыі заяўніка (Declaration by the applicant), якая ўключана ў форму заяўкі на грант (Дадатак А), заяўнік мусіць пацвердзіць, што ён не знаходзіцца ні ў адной з гэтых сітуацый.*

## 2.1.2. КРЫТЭРЫІ ПРЫМАЛЬНАСЦІ ДА ВІДАЎ ДЗЕЙНАСЦІ (ПРЫЯРЫТЭТЫ І ВІДЫ ДЗЕЙНАСЦІ ДЛЯ ЛОТА 1 І ВІДЫ ДЗЕЙНАСЦІ ДЛЯ ЛОТАЎ 2, 3)

Праект складаецца з шэрагу ўзгодненых дзеянняў, накіраваных на дасягненне запланаваных вынікаў і мэтаў.

**Сектары ці тэмы, да якіх мусяць адносіцца праекты:**

**Тэматычныя прыярытэты Лота 1:**

**Прыярытэт 1.** Падтрымка грамадзянскай актыўнасці і захавання дэмакратычных супольнасцяў у Беларусі.

**Прыярытэт 2.** Садзейнічанне новым грамадскім дыскурсам і культурным наратывам у беларускім грамадстве.

**Прыярытэт 3.** Падтрымка праектаў, якія прапануюць сацыяльныя і тэхналагічныя інавацыі ці маштабуюць найлепшыя практыкі для развіцця сучаснай свядомасці беларускага грамадства, яго здольнасці да самаарганізацыі і салідарных дзеянняў.

**Прыярытэт 4.** Развіццё адукацыйных матэрыялаў для грамадзянскай адукацыі, у тым ліку для анлайн-навучання на платформе Belarus Beehive.

Набор прыярытэтаў можа быць зменены або пашыраны на наступных этапах конкурсу на падставе штогадовых кансультацый, якія праводзяцца для ацэнкі патрэб Беларусі ў знешняй дапамозе ў супрацы з донарамі.

Праекты ў рамках Прыярытэта 4 Лота 1 могуць падавацца арганізацыямі і ініцыятывамі, якія працуюць у сферы нефармальнай адукацыі і анлайн-адукацыі.

Праекты ў рамках Лотаў 2 і 3 (арганізацыйнае развіццё) могуць падавацца арганізацыямі любога тэматычнага сектара. Аднак прыярытэтам для падтрымкі інстытуцыйнага і арганізацыйнага развіцця будуць арганізацыі, якія з’яўляюцца «цэнтрамі прыцягнення» для беларускага грамадства і аказваюць вельмі запатрабаваныя паслугі, у першую чаргу для грамадзянскай супольнасці ўнутры Беларусі.

**Месцазнаходжанне**

Актыўнасці мусяць адбывацца ў Беларусі, а таксама ў еўрапейскіх краінах (ЕС, Усходняе партнёрства, ЕЭЗ), дзе заснаваны арганізацыі грамадзянскай супольнасці, створаныя беларусамі ў эміграцыі.

## Віды актыўнасцяў, якія могуць фінансавацца:

**Прыярытэты для Лота 1:** падтрымліваюцца праекты, якія дазваляюць супольнасцям, грамадскім арганізацыям і ініцыятывам аказваць паслугі сваім мэтавым групам у Беларусі, павялічваць уплыў сваіх дзеянняў або рэалізоўваць інавацыйныя ідэі.

### Прыярытэт 1. Падтрымка грамадзянскай актыўнасці і захавання дэмакратычных супольнасцяў у Беларусі, *магчымыя віды дзейнасці:*

– падтрымка дэмакратыі, абарона правоў чалавека і грамадзянскіх свабод;

– прадухіленне праяў агрэсіі на мясцовым, нацыянальным і рэгіянальным узроўнях, а таксама меры дзеля прадухілення нармалізацыі ў грамадстве таталітарных
і імперыялістычных практык;

– адукацыйныя, культурныя, даследчыцкія актыўнасці, праекты на гендарныя і экалагічныя тэмы на мясцовым і нацыянальным узроўнях;

– павышэнне эканамічнай стабільнасці грамадзян на мясцовым узроўні і іх фінансавай пісьменнасці;

– кансультаванне, навучанне, настаўніцтва паводле прынцыпу «роўны – роўнаму»; – падтрымка пацярпелых (напрыклад, пацярпелых ад гвалту, дыскрымінацыі, вайны і г. д.);

– тэрміновая псіхалагічная дапамога ў крызісных сітуацыях;

– стварэнне IT-прадуктаў, напісанне, рэдагаванне і выданне кніг, стварэнне іншага кантэнту для далейшага распаўсюджвання;

– перадача і маштабаванне найлепшых практык;

– правядзенне спартыўных і забаўляльных мерапрыемстваў для супольнасцяў;

– паездкі, калі гэта неабходна для дзейнасці, удзел у мерапрыемствах і працоўных сустрэчах за мяжой, фінансавыя і адміністрацыйныя выдаткі заяўнікаў.

**Прыярытэт 2. Садзейнічанне новым грамадскім дыскурсам і культурным наратывам у беларускім грамадстве, магчымыя віды дзейнасці:**

– інфармацыйныя, культурныя, адукацыйныя або камбінаваныя дзейнасці, якія дазваляюць насельніцтву выйсці з уплыву агенды «рускага свету», «паслясавецкай прасторы», віктымізацыі і г. д.;

– развіццё і распаўсюджванне інавацыйных тэхналагічных інструментаў, якія дазваляюць АГС быць больш эфектыўнымі і абароненымі;

– дзейнасць, накіраваная на пераадоленне межаў паміж беларускім грамадствам унутры і звонку краіны;

– мерапрыемствы для вырашэння праблем, напрыклад у фармаце мазгавога штурму, міжсектаральныя мерапрыемствы;

– інфармацыйныя або адвакацыйныя кампаніі;

– перадача і маштабаванне найлепшых практык у гэтых тэмах.

**Прыярытэт 3. Падтрымка праектаў, якія прапануюць сацыяльныя і тэхналагічныя інавацыі ці маштабуюць найлепшыя практыкі для развіцця сучаснай свядомасці беларускага грамадства, яго здольнасці да самаарганізацыі і салідарных дзеянняў, магчымыя віды дзейнасці:**

– дзейнасць у павышэнні дасведчанасці, адукацыі, ахове навакольнага асяроддзя, культуры, сацыяльна адказным прадпрымальніцтве, правах чалавека, зялёнай эканоміцы, супраціве гвалту, сацыяльных і працоўных праблемах і ў іншых галінах, якая распаўсюджвае інавацыйныя падыходы, добрыя практыкі, забяспечвае аказанне паслуг у гэтых сферах на мясцовым узроўні ў Беларусі і ў трансмежным фармаце;

– падтрымка развіцця сектаральных і міжсектаральных парадкаў дзеянняў, стратэгій і праграм для супольных дзеянняў АГС;

– падтрымка жыцця мясцовых, прафесійных і іншых супольнасцяў у Беларусі.

**Прыярытэт 4: Развіццё адукацыйных матэрыялаў і кантэнту для грамадзянскай адукацыі, у тым ліку для анлайн-навучання на платформе Belarus Beehive.**

Адукацыйныя матэрыялы могуць мець мэтавымі аўдыторыямі розныя сацыяльныя, прафесійныя і ўзроставыя групы беларускага грамадства.

Яны могуць ахопліваць шырокае кола тэм, якія садзейнічаюць дасягненню прыярытэтаў праграмы Belarus Beehive, а менавіта:

– захаванне і развіццё дэмакратычных супольнасцяў у Беларусі;

– садзейнічанне новым грамадскім дыскурсам і культурным наратывам у беларускім грамадстве;

– падтрымка і распаўсюджванне сацыяльных і тэхналагічных інавацый і лепшых практык;

– развіццё сучаснай свядомасці беларускага грамадства, яго здольнасці да самаарганізацыі і салідарных дзеянняў.

Таксама могуць быць падтрыманы адукацыйныя матэрыялы па пытаннях функцыянавання і арганізацыйнага развіцця няўрадавых некамерцыйных арганізацый, калі яны закранаюць актуальныя і недастаткова прадстаўленыя ў адукацыйнай прасторы тэмы (напрыклад, прыцягненне сродкаў ад прыватных або карпаратыўных спонсараў, адвакацыя ў канкрэтным тэматычным сектары, юрыдычныя і фінансавыя рамкі працы НДА ў краіне эміграцыі і г. д.).

**Спіс прыярытэтных тэм адукацыйных курсаў і праграм:**

– Тэмы, якія пашыраюць гарызонт ведаў і ўяўленняў актывістаў грамадзянскай супольнасці: дзяржава і права, самакіраванне, кіраванне зменамі, грамадзянская супольнасць, канфліктагогія, крытычнае мысленне, сфера міжнароднай падтрымкі, тэхналагічныя і сацыяльныя інавацыі, практыкі сучаснай дэмакратыі (партысіпатыўнае кіраванне, супольнасці, бюджэтнае планаванне), правы чалавека, сектаральныя палітыкі і роля грамадскага фокусу кіравання ў сферах адукацыі, культуры, медыя, экалогіі, сацыяльнай і г.д.

– Базавыя веды ў сферы кіравання АГС: стратэгічны менеджмент, стратэгічныя камунікацыі, арганізацыйны менеджмент, фінансавы менеджмент, чалавечыя рэсурсы, асновы адвакацыі, праектны менеджмент, розныя тыпы фандрайзінгу, асновы тэорыі змен, логіка-структурны падыход і г.д.

– Пісьменнасць у галіне грамадзянскай адукацыі, а менавіта: лічбавая, грамадзянска-прававая, фінансавая, моўная, медыя-пісьменнасць, экалагічная, камунікатыўная; пісьменнасць у сферы псіха-, стрэсаўстойлівасці і г.д.

**Магчымыя віды дзейнасці:**

– вытворчасць і развіццё адукацыйных і асветніцкіх матэрыялаў розных фарматаў, такіх як анлайн-курсы, інтэрактыўныя лонгрыды, тэкставыя курсы, дапаможнікі, метадычкі, серыі мульцікаў ці падкастаў, чат-боты і іншыя;

– вытворчасць і развіццё новых адукацыйных праграм, якія ўключаюць курсы і іншыя адукацыйныя фарматы па комплексе прадметаў.

– Праекты таксама маюць прадугледжваць меры па прасоўванні гэтых матэрыялаў, курсаў і праграм.

Мы асабліва вітаем распрацоўку адукацыйных матэрыялаў на беларускай мове.

**Адукацыйныя матэрыялы павінны адпавядаць наступным базавым прынцыпам:**

– павага да прынцыпаў інтэлектуальнай уласнасці і свабоды меркаванняў;

– выкарыстанне паважлівай мовы і адсутнасць мовы варожасці;

– усе тэксты павінны быць граматычна правільнымі;

– адсутнасць камерцыйнай рэкламы;

– павага да гендарнай роўнасці і правоў меншасцяў;

– адпаведнасць GDPR.

Абавязковай умовай з'яўляецца размяшчэнне аўтарамі распрацаваных курсаў і іншых адукацыйных матэрыялаў на платформе **learn4belarus.online**. Пры гэтым аўтары не будуць абмежаваныя ў сваіх правах размяшчаць гэтыя матэрыялы на іншых рэсурсах.

За месяц да дэдлайна падачы праектных прапаноў плануецца інфасесія, прысвечаная распрацоўцы адукацыйных курсаў і матэрыялаў. Падрабязная інфармацыя будзе размешчана на старонцы **learn4belarus.online.**

## Віды дзейнасці, якія могуць фінансавацца ў Лоце 2:

**Падтрымка арганізацыйнага развіцця і інстытуцыйная падтрымка АГС,**

магчымыя віды дзейнасці:

– умацаванне арганізацый і ажыццяўленне арганізацыйных змен (распрацоўка і ўмацаванне працэдур і ўнутранай палітыкі, умацаванне сувязяў з

грамадскасцю, пабудова партнёрства, бяспека і іншыя змены, вызначаныя ў арганізацыйнай ацэнцы і плане арганізацыйнага развіцця АГС);

– развіццё інструментаў камунікацыі (у тым ліку карпаратыўных вэб-сайтаў і акаўнтаў у сацыяльных сетках);

– меры для павышэння кваліфікацыі і эфектыўнасці супрацоўнікаў, валанцёраў і сябраў; меры для набору новых сябраў або валанцёраў;

– правядзенне арганізацыйных сустрэч, стратэгічных сесій, ментарства; – стажыроўкі, навучанне для паляпшэння функцыянавання арганізацыі,

яе аператыўнага патэнцыялу, прадухіленне і вырашэнне канфліктаў;

– асноўнае забеспячэнне: набыццё абсталявання, арэнда памяшканняў; падтрымка асноўнага складу супрацоўнікаў асобных падраздзяленняў (аддзелаў); агульныя арганізацыйныя аўдыты.

**Віды дзейнасці, якія могуць фінансавацца ў Лоце 3. Падтрымка кааліцый АГС, устаноў сектаральнай палітыкі і сетак, магчымыя віды дзейнасці:**

– умацаванне арганізацыйных змен (распрацоўка і ўмацаванне працэдур, унутраная палітыка, сувязі з грамадскасцю, пабудова партнёрства, бяспека і іншыя змены, вызначаныя ў арганізацыйнай ацэнцы і плане арганізацыйнага развіцця);

– даследаванні мэтавых груп і іх патрэб;

– развіццё інструментаў камунікацыі (у тым ліку карпаратыўных вэб-сайтаў і акаўнтаў у сацыяльных сетках);

– вызначэнне і адвакацыя тэматычных або сектаральных патрэб, прасоўванне мэсіджаў і нарматываў;

– меры для павышэння кваліфікацыі і эфектыўнасці працы супрацоўнікаў і чальцоў рады кааліцыі; дзейнасць для прыцягненні новых сябраў і прыхільнікаў;

– падтрымка сустрэч персаналу і рады арганізацыі ў выпадку працы ў трансмежным фармаце, сесій стратэгічнага планавання;

– стажыроўкі, адукацыя і навучанне на працоўным месцы для паляпшэння функцыянавання арганізацыі, яе аператыўнага патэнцыялу, прадухілення і вырашэння канфліктаў;

– асноўнае забеспячэнне: набыццё абсталявання, арэнда памяшканняў; падтрымка асноўнага складу супрацоўнікаў і асобных аддзелаў пры неабходнасці.

**Працягласць**

Мінімальная працягласць праектаў у Лоце 1 складае 2 месяцы, максімальная – 12 месяцаў. Большы тэрмін рэалізацыі можа быць разгледжаны ў выпадку добра абгрунтаваных прапаноў. Максімальная працягласць праектаў у Лоце 1, 4 прыярытэце  складае 6 месяцаў.

Мінімальная працягласць праектаў у Лотах 2 і 3 складае 3 месяцы.

**Усе праекты маюць быць цалкам завершаныя да 31 сакавіка 2026 г.**

Праекты пачынаюцца з даты, указанай у кантракце. Не дапускаецца фінансаванне дзейнасці, якая была рэалізавана да афіцыйнага старту праекта.

## 2.1.3. КРЫТЭРЫІ ПРЫМАЛЬНАСЦІ ВЫДАТКАЎ

Грантавая падтрымка ажыццяўляецца ў форме кампенсацыі выдаткаў. Грант можа пакрыць толькі прымальныя выдаткі.

Ніжэй пазначаны катэгорыі прымальных і непрымальных выдаткаў.

**Магчымыя прамыя выдаткі**

**Выдаткі ў праекце мусяць адпавядаць планаванай дзейнасці, апісанай у тэксце праектнай прапановы.** Заяўнікі згаджаюцца з тым, што праверка(-і) выдаткаў, згаданая(-ыя) у кантракце аб гранце, будзе праводзіцца аўдытарам, якога наймае праграма Belarus Beehive 2.0.

**Магчымыя ўскосныя выдаткі**

Ускосныя выдаткі, панесеныя арганізацыяй у сувязі з рэалізацыяй праекта, таксама з’яўляюцца прымальнымі. Яны могуць фінансавацца паводле фіксаванай стаўкі, але іх агульная сума не можа перавышаць 7 % разліковай агульнай сумы прымальных прамых выдаткаў. Ускосныя выдаткі з’яўляюцца прымальнымі пры ўмове, што яны не ўключаюць у сябе выдаткі, аднесеныя да іншай катэгорыі бюджэту. Заяўніка могуць папрасіць абгрунтаваць запытаны працэнт перад падпісаннем дамовы аб гранце. Аднак пасля ўстанаўлення фіксаванай стаўкі пры справаздачы ніякіх пацвярджальных дакументаў падаваць ужо не трэба.

**Натуральныя ўнёскі**

*Натуральныя ўнёскі* – гэта бясплатная перадача для атрымальніка гранта тавараў або паслуг трэцяй асобай. Паколькі натуральныя ўнёскі не прадугледжваюць ніякіх выдаткаў для атрымальнікаў гранта, яны не з’яўляюцца прымальнымі выдаткамі і не могуць быць уключаны ў бюджэт.

**Недапушчальныя выдаткі**

Наступныя выдаткі не могуць быць падтрыманы:

– даўгі і плацяжы для абслугоўванні доўгу (працэнты);
– рэзервы на пакрыццё страт або магчымых будучых абавязкаў;
– заяўленыя выдаткі, якія фінансуюцца іншымі праграмамі ЕС і іншымі донарамі;
– купля зямлі або будынкаў;
– страты пры абмене валют;
– пошліны, падаткі і зборы, уключна з VAT, за выключэннем выпадкаў, калі яны не кампенсуюцца ў адпаведнасці з нацыянальным падатковым заканадаўствам, і сацыяльных падаткаў на заробкі;
– крэдыты трэцім асобам;
– штрафы, пені і судовыя выдаткі, звязаныя з жыццядзейнасцю менавіта арганізацыі;
– натуральныя ўнёскі.

## 2.2. КОЛЬКАСЦЬ ЗАЯВАК І ГРАНТАЎ НА АДНАГО ЗАЯЎНІКА:

– Заяўнік можа падаць больш за 1 заяўку ў рамках гэтага конкурсу прапаноў;
– Заяўнік можа атрымаць больш за 1 грант у рамках гэтага конкурсу прапаноў толькі ў тым выпадку, калі гэтыя гранты ўваходзяць у розныя лоты;
– Заяўнік можа быць сузаяўнікам у іншай заяўцы адначасова;
– Сузаяўнік не можа быць сузаяўнікам больш чым у 2 заяўках у рамках гэтага конкурсу прапаноў;
– Сузаяўніку можа быць прысуджана больш за 2 субгранты ў рамках гэтага конкурсу прапаноў толькі ў тым выпадку, калі гэтыя субгранты ўваходзяць у розныя лоты;
– Пасля паспяховай рэалізацыі праекта і справаздачнасці заяўнік можа падаць заяўку на наступныя конкурсы ў рамках таго ж або іншага лота.

Згодна з рэгламентацыйнымі дакументамі Еўрапейскай камісіі, у рэгрантавых праграмах **існуе абмежаванне на атрыманне адной арганізацыяй ці ініцыятывай сумы, большай за 60 000 еўра.** Гэта тычыцца ўсіх лотаў на ўсіх тэрмінах падачы на грантавы конкурс.

Менеджмент праграмы вядзе цяпер перамовы з донарам наконт скасавання гэтага абмежавання для дасягнення мэтаў праграмы Belarus Beehive 2.0. Пры змене пазіцыі донара заяўнікам будзе паведамлена пра гэта праз наяўныя каналы камунікацыі.

Гэта абмежаванне не датычыць арганізацый, якія прадастаўляюць свае паслугі фіскальнага партнёрства ініцыятывам, якія не маюць зарэгістраванага статусу і банкаўскага рахунка.

## 3. БАЧНАСЦЬ ПРАЕКТА

Падчас рэалізацыі праекта ва ўсіх публічных згадках пра падтрыманы праект і яго прадуктаў мусіць быць згадана падтрымка ад Belarus Beehive, калі гэта не аказвае негатыўнага ўплыву на дзейнасць заяўніка. У выпадку, калі праект рэалізуецца пераважна на тэрыторыі Беларусі і сіламі выканаўцаў у Беларусі, патрабаванняў да бачнасці праекта няма.

## 4. ЭТЫЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ І КОДЭКС ПАВОДЗІН

### а) Адсутнасць канфлікту інтарэсаў

Заяўнікі не могуць закранацца канфліктам інтарэсаў і не могуць мець эквівалентныя адносіны ў гэтым плане з іншымі заяўнікамі або бакамі, якія ўдзельнічаюць у праекце. Любая спроба заяўніка атрымаць канфідэнцыйную інфармацыю, заключыць незаконныя пагадненні з канкурэнтамі або паўплываць на Адборачную камісію або бенефіцыярыя праекта ў працэсе разгляду, удакладнення, ацэнкі і параўнання заявак прывядзе да адхілення заяўкі і можа прывесці да адміністрацыйнай адказнасці і штрафных санкцый.

### б) Павага да правоў чалавека, а таксама прыродаахоўнага заканадаўства і асноўных працоўных стандартаў

Заяўнікі і супрацоўнікі мусяць паважаць правы чалавека. У прыватнасці і ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам краіны знаходжання, заяўнікі, якія заключылі дамову, мусяць выконваць прыродаахоўнае заканадаўства, у тым ліку шматбаковыя экалагічныя пагадненні, а таксама асноўныя працоўныя стандарты, якія прымяняюцца і вызначаны ў адпаведных канвенцыях Міжнароднай арганізацыі працы (такіх як Канвенцыі аб свабодзе аб'яднанняў і калектыўных перамоў, ліквідацыі прымусовай і абавязковай працы, ліквідацыі дзіцячай працы).

**Нулявая цярпімасць да сексуальнай эксплуатацыі і сексуальнага гвалту:**

Belarus Beehive прымяняе **палітыку «нулявой цярпімасці»** да ўсіх супрацьпраўных дзеянняў, якія ўплываюць на прафесійны аўтарытэт заяўнікаў.

Фізічны гвалт ці пакаранне, або пагрозы фізічнага гвалту, сексуальнага гвалту ці эксплуатацыі, пераслед і слоўныя абразы, а таксама іншыя формы запалохвання цалкам недапушчальныя.

**в) Барацьба з карупцыяй і хабарніцтвам**

Кандыдаты мусяць выконваць усе дзейныя законы, правілы і кодэксы, якія тычацца барацьбы з хабарніцтвам і карупцыяй. У кантэксце гэтага палажэння «карупцыйныя дзеянні» – гэта прапанова хабару, падарунка, узнагароды або камісіі любой асобе ў якасці заахвочвання або ўзнагароджання за выкананне або ўстрыманне ад любога дзеяння, звязанага з заключэннем кантракта на грант або з выкананнем ужо заключанага кантракта.

Праграма Belarus Beehive пакідае за сабой права прыпыніць або адмяніць фінансаванне праекта, калі карупцыйныя практыкі любога роду будуць выяўлены на любой стадыі рэалізацыі праекта.

**г) Парушэнне кантрактных абавязацельстваў, працэдур або махлярства**

У выпадку, калі ёсць доказы, што мела месца махлярства або парушэнне працэдуры пры выдачы гранта, кантрактных абавязацельстваў, іншых палажэнняў Этычнага кодэкса, праграма Belarus Beehive можа ўстрымацца ад заключэння кантракта ці нават спыніць дзеянне кантракта на грант.

**д) Палітыка інфармавання аб парушэннях**

Пра любыя падазрэнні ў махлярстве або карупцыі можна паведаміць на эл. адрас: pascal.willaumez@eap-csf.eu

# 5. ПРАЦЭС ПАДАЧЫ ЗАЯЎКІ І ПРАЦЭДУРЫ

## 5.1. ПРАЕКТНЫЯ ПРАПАНОВЫ

Праектныя прапановы мусяць быць дасланы праз вэб-аплікацыю Beesystem (*гл. Раздзел 5.2.*) з усімі запоўненымі дадаткамі (Дадаткі A, B, C). Прапановы мусяць строга прытрымлівацца фармату, абзацы і старонкі мусяць быць запоўнены ў належным парадку. Заяўнікі могуць падаваць заяўкі на беларускай, рускай або англійскай мовах.

Для бяспечнай працы з вэб-аплікацыяй Beesystem і захавання канфідэнцыйнасці інфармацыі неабходна выконваць наступныя рэкамендацыі (*гл. Раздзел 1.3*):

– Карыстайцеся толькі індывідуальнымі электроннымі поштамі, створанымі спецыяльна для працы з вэб-аплікацыяй Beesystem;

– Заходзьце ў сістэму выключна з камп’ютараў, пазбягаючы выкарыстання мабільных прылад;

– Уключайце рэжым інкогніта ў браўзеры пры ўваходзе і працы ў сістэме;

– Падключайцеся праз VPN, каб забяспечыць канфідэнцыйнасць і бяспеку вашых дадзеных.

Калі ласка, запаўняйце форму праектнай прапановы ўважліва і як мага дакладней, каб яе можна было правільна ацаніць. Любая памылка або неадпаведнасці, пералічаныя ў Раздзеле 5.3.1. (*Крок 1: Адміністрацыйная праверка*), могуць прывесці да адмовы ў далейшым разглядзе.

Звярніце ўвагу, што толькі форма праектнай прапановы з убудаваным бюджэтам (з Дэкларацыяй заяўніка і Мандатамі сузаяўнікаў, калі такія ёсць) і дадатак, які неабходна прыкласці для Лотаў 2 і 3 (Ацэнка арганізацыйнага патэнцыялу), будуць перададзены на ацэнку. Таму вельмі важна, каб гэтыя дакументы ўтрымлівалі ЎСЮ рэлевантную інфармацыю.

Ніякіх іншых дадаткаў дасылаць не трэба.

## 5.2. КУДЫ І ЯК АДПРАЎЛЯЦЬ ПРАЕКТНЫЯ ПРАПАНОВЫ

5.2.1. Падача праектных прапаноў у конкурсе Belarus Beehive ажыццяўляецца праз спецыялізаваную вэб-аплікацыю Beesystem.

5.2.2. Для таго, каб атрымаць доступ да вэб-аплікацыі Beesystem, праз якую падаюцца праектныя прапановы, вам неабходна запоўніць форму: **https://forms.gle/ioyRXLX5EXbRVgN36.**

*На працягу 24 гадзін вы атрымаеце на свой электронны адрас ліст з інструкцыяй. Для вас будзе створана індывідуальная электронная пошта на абароненым сэрвісе Gmail (Google-акаўнт), зайшоўшы на якую, вы ўбачыце спасылку на вэб-аплікацыю. Калі ў вас ужо ёсць створаны акаўнт і доступ да вэб-аплікацыі, вы можаце працягнуць працу праз яго без неабходнасці запыту новага доступу.*

Уся далейшая камунікацыя наконт вашай праектнай прапановы будзе весціся праз гэты адрас электроннай пошты. Калі ласка, уважліва пастаўцеся да яе.

**Калі вы запаўняеце праектную прапанову з Беларусі, то карыстайцеся VPN.** Звярніце ўвагу, што выкарыстанне VPN з'яўляецца толькі часткай правілаў па бяспецы. Настойліва раім азнаёміцца з поўным спісам рэкамендацый у пункце 1.3 гэтага Палажэння, каб забяспечыць максімальную бяспеку вашых дадзеных і дзейнасці.

5.2.3. Перад тым, як прыступіць да запаўнення праектнай прапановы, рэкамендуем вам уважліва азнаёміцца з умовамі конкурсу. Акрамя запоўненай праектнай прапановы, важна таксама запоўніць і падпісаць усе дадаткі, якія з'яўляюцца абавязковымі. Усе неабходныя формы, а таксама падрабязныя інструкцыі па запаўненні праектнай прапановы, складанні бюджэту і карыстанні сістэмай вы зможаце знайсці ў вэб-аплікацыі ў раздзеле "Шаблоны дакументаў".

5.2.4. Пасля таго, як вы запоўніце форму праектнай прапановы і далучыце ўсе неабходныя дадаткі, у вас будзе магчымасць захаваць яе на свой камп'ютар. Пасля таго, як вы націсніце кнопку «АДПРАВІЦЬ», змены ў праектную прапанову больш прымацца не будуць. Калі кнопка «адправіць» не з'явілася або не актыўная, гэта значыць, што вы не запоўнілі некаторыя з абавязковых палёў. Пасля націскання гэтай кнопкі ваша праектная прапанова будзе афіцыйна зарэгістравана, на ваш электронны адрас прыйдзе паведамленне пра яе прынянцце.

5.2.5. Пасля адпраўкі ваша заяўка будзе ўважліва разгледжана ў адпаведнасці з устаноўленымі ў п. 5.3 тэрмінамі, пазначанымі ва ўмовах конкурсу. Вам будзе накіравана інфармацыя пра вынікі разгляду на выдадзены электронны адрас. Мы настойліва рэкамендуем вам рэгулярна, не радзей за два разы на тыдзень, правяраць сваю пошту на прадмет магчымых дадатковых пытанняў ад арганізатараў конкурсу.

5.2.6. Калі ў вас узнікнуць дадатковыя пытанні наконт працэсу падачы заяўкі ці ўмоў конкурсу, вы можаце звяртацца да нас з пытаннямі. Мы стварылі Google-форму для пытанняў заяўнікаў, якую можна запоўніць, перайшоўшы па гэтай спасылцы: **https://forms.gle/LkTNTtJEe7trUdDR6.** Мы будзем адказваць на вашыя пытанні на працягу двух працоўных дзён, каб забяспечыць усю неабходную падтрымку для паспяховага ўдзелу ў конкурсе.

## 5.3. АДБОР ПРАЕКТНЫХ ПРАПАНОЎ

Заяўкі будуць разглядацца Адборачнай камісіяй праекта Belarus Beehive пры дапамозе знешніх ацэншчыкаў.

Калі разгляд заяўкі выяўляе, што прапанаванае дзеянне не адпавядае прыярытэтам конкурсу або крытэрыям прымальнасці, указаным у Раздзеле 2.1, заяўка будзе адхілена толькі на гэтай падставе.

**Адбор праектных прапаноў складаецца з наступных крокаў:**

1. Адміністрацыйная праверка;
2. Ацэнка праектнай прапановы;
3. Пасяджэнне Адборачнай камісіі;

4. Паведамленне пра рашэнне Адборачнай камісіі;
5. Праверка прымальнасці заяўнікаў для заключэння кантрактаў.

*Ніжэй падрабязна можаце азнаёміцца з дэталямі кожнага кроку.*

## 5.3.1. КРОК 1: АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ ПРАВЕРКА

Пры адміністрацыйнай праверцы будзе ацэньвацца:

- Ці быў выкананы тэрмін падачы праектнай прапановы;
- Ці адпавядае праектная прапанова ўсім крытэрыям прымальнасці, пазначаным у п. 2.1 гэтага Палажэння;
- Ці змяшчае праектная прапанова ўвесь камплект запытаных дакументаў, ці ўсе палі формы праектнай прапановы і бюджэту запоўнены запатрабаванай інфармацыяй;
- Ці прастаўлены патрабаваныя пазнакі ў Дэкларацыі;
- Ці трапляе праектная прапанова ў спіс прыярытэтных тэм, пазначаных у п. 2.1.2. гэтага Палажэння (для Лот 1, 4 прыярытэт);
- Ці аўтары праекта даюць згоду на размяшчэнне адукацыйных курсаў і матэрыялаў на платформе learn4belarus.online (для Лот 1, 4 прыярытэт).

Калі якая-небудзь запытаная інфармацыя адсутнічае або з'яўляецца непраўдзівай ці няпоўнай, заяўка можа быць адхілена толькі на гэтай падставе.

### 5.3.1.1. Працэдура абскарджання рашэння пасля адміністрацыйнай праверкі

Калі заяўнік лічыць, што яго заяўка была адхілена падчас адміністрацыйнай праверкі неабгрунтавана, ён можа абскардзіць гэтае рашэнне на працягу трох дзён.

Для гэтага неабходна звязацца з грант-менеджарамі праз эл. пошту **bh2.0.communication@belarusbeehive.eu** і папрасіць больш падрабязна растлумачыць прычыну адхілення заяўкі на этапе адміністрацыйнай праверкі / адмовы ў разглядзе.

Калі пасля тлумачэнняў грант-менеджара заяўнік па-ранейшаму не згодны з прычынай адхілення заяўкі, ён можа даслаць скаргу праз эл. пошту **complaints@belarusbeehive.eu**. Скарга будзе разгледжана ў тэрмін да 5 працоўных дзён камісіяй, якая складаецца з прадстаўнікоў Кіраўніцтва праграмы Belarus Beehive.

На падставе разгляду скаргі камісія падрыхтуе Пратакол. Рашэнне будзе адпраўлена заяўніку на працягу аднаго працоўнага дня пасля пасяджэння

Камісіі. У выпадку задавальнення скаргі праект будзе разгледжаны далей на агульных падставах.
У выпадку адмоўнага рашэння Камісіі праект будзе адхілены. Рашэнне Камісіі з'яўляецца канчатковым і абскарджанню не падлягае.

## 5.3.2. КРОК 2: АЦЭНКА ПРАЕКТНАЙ ПРАПАНОВЫ

Праектныя прапановы, якія прайшлі адміністрацыйную праверку, будуць ацэньвацца на падставе іх якасці, у тым ліку прапанаванага бюджэту, і на падставе аперацыйных магчымасцяў заяўнікаў.

Кожная праектная прапанова ацэньваецца ў спецыяльнай табліцы мінімум двума знешнімі экспертамі незалежна адно ад аднаго. Эксперты выбіраюцца з ліку прафесіяналаў у тэме кожнага лота, на конкурснай аснове, але з улікам аспектаў бяспекі. Эксперты выкажуць сваё меркаванне, запоўняць табліцу балаў (ацэначную сетку), выставяць балы і пакінуць каментарыі, у тым ліку каментарыі да бюджэту і канчатковую рэкамендацыю для Адборачнай камісіі наконт падтрымання ці непадтрымання праекта.

**Вы можаце азнаёміцца з Ацэначнымі сеткамі для ўсіх лотаў у вэб-аплікацыі для падачы праектных прапаноў у раздзеле “Шаблоны дакументаў”.**

Ваша праектная прапанова можа набраць максімум 100 балаў.
Калі сярэднеарыфметычная колькасць балаў на падставе дзвюх і болей экспертных ацэнак будзе складаць меней за 65 балаў, то праектная прапанова будзе адхілена. У выпадку, калі меркаванні двух экспертаў будуць адрознівацца больш чым на 33 балы, праект будзе накіраваны як мінімум яшчэ аднаму эксперту для дадатковай ацэнкі.

Пасля ацэнкі будзе складзена табліца з пералікам праектных прапаноў, ранжыраваных паводле балаў. Праектныя прапановы з найбольшай колькасцю балаў будуць разглядацца Адборачнай камісіяй паводле чаргі, ад найбольш высока ацэненых да найменш, да вычарпання бюджэту гэтага этапу конкурсу прапаноў і адпаведнага лота. На падставе такіх жа крытэрыяў будзе сфармаваны рэзервовы спіс з прапаноў, якія набралі высокія балы, але не змясціліся ў бюджэт гэтага этапу конкурсу. Гэты спіс будзе выкарыстоўвацца, калі на працягу перыяду да наступнага этапу конкурсу праграме Belarus Beehive стане даступна больш сродкаў.

**Тэрмін ацэнкі праектнай прапановы не можа перавышаць 1 месяц.**

## 5.3.3. КРОК 3: ПАСЯДЖЭННЕ АДБОРАЧНАЙ КАМІСІІ

Не пазней чым праз 45 дзён пасля заканчэння кожнага тэрміну падачы праектных прапаноў Адборачная камісія збярэцца анлайн або ў гібрыдным фармаце для абмеркавання ацэненых праектаў і прыняцця канчатковага рашэння.

Адборачная камісія будзе складацца мінімум з 5 чальцоў з шэрагу:

– Прадстаўнікоў, прызначаных кожнай партнёрскай арганізацыяй Belarus Beehive, у якіх адсутнічаюць прамыя ці ўскосныя канфлікты інтарэсаў;

– Давераных і паважаных беларускіх ці міжнародных прадстаўнікоў АГС / сетак / дэмакратычных арганізацый, у якіх адсутнічаюць прамыя ці ўскосныя канфлікты інтарэсаў.

Акрамя чальцоў камісіі, у пасяджэннях Адборачнай камісіі могуць прымаць удзел знешнія эксперты, нанятыя для ацэнкі праектных прапаноў, у якасці кансультантаў без права голасу.

Прадстаўнікі донара будуць запрашацца для ўдзелу ў пасяджэннях Адборачнай камісіі ў якасці назіральнікаў.

Кожны чалец мае толькі адзін голас. Адборачную камісію ўзначальвае кіраўнік праграмы Belarus Beehive, які не мае права голасу.

Адборачная камісія прымае рашэнні на падставе папярэдняй ацэнкі якасці заявак знешнімі незалежнымі экспертамі, а таксама на падставе мэт праграмы і неабходнасці расставіць прыярытэты ў бягучай сітуацыі.

Адборачная камісія пакідае за сабой права ўмоўна зацвердзіць праектную прапанову з рэкамендацыямі наконт карэктавання самой прапановы і/ці яе бюджэту ў адпаведнасці з канкрэтнымі заўвагамі, зробленымі экспертамі ці самой камісіяй, у тым выпадку, калі гэта не ставіць пад сумнеў само прысуджэнне гранта.

У такіх выпадках грант-менеджары далей разам з заяўнікамі адкарэктуюць праектныя прапановы ў адпаведнасці з рэкамендацыямі Адборачнай камісіі.

Адборачная камісія рыхтуе ўнутраны папярэдні **Пратакол** з пералікам зацверджаных, адхіленых ці ўключаных у рэзервовы спіс праектаў з усімі рэкамендацыямі.

Пасля праверкі прымальнасці заяўнікаў і ўдакладнення і дапрацоўкі бюджэтаў Адборачная камісія зацвярджае **канчатковы Пратакол**.

Пасля рашэння Адборачнай камісіі ў выпадку, калі заяўка будзе ацэнена як патэнцыйна добрая, але пры гэтым будзе патрабаваць паляпшэння і не набярэ дастаткова балаў у бягучым конкурсе, заяўніку прапануецца дапамога кансультанта/ментара або грант-менеджара для дапрацоўкі заяўкі ў адпаведнасці з патрабаваннямі конкурсу і рэкамендацыямі Адборачнай камісіі.

У гэтым выпадку заяўка можа быць:

– перапададзена падчас будучага конкурсу;
– прадстаўлена (у скарочаным выглядзе) на разгляд іншым донарам *(толькі з пісьмовай згоды заяўніка).*

Пасля праверкі пацвярджальных дакументаў і ўдакладнення бюджэту пасля дапрацоўкі Адборачная камісія зацвярджае **канчатковы Пратакол**.

### 5.3.4. КРОК 4: ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРА РАШЭННЕ

Заяўнікі будуць пісьмова праінфармаваны супрацоўнікамі праграмы Belarus Beehive наконт рашэння адносна іх праектнай прапановы і, у выпадку адмовы, наконт прычыны адмоўнага рашэння.

Заяўнікі могуць запытаць у праграмы Belarus Beehive больш падрабязную інфармацыю наконт прынятага рашэння.

### 5.3.5. КРОК 5: ПРАВЕРКА ПРЫМАЛЬНАСЦІ ЗАЯЎНІКАЎ ДЛЯ ЗАКЛЮЧЭННЯ КАНТРАКТАЎ

Праверка прымальнасці будзе праводзіцца на аснове пацвярджальных дакументаў, запытаных у заяўніка праекта. Гэта будзе выканана толькі для праектных прапаноў, якія былі папярэдне адабраны Адборачнай камісіяй.

Прымальнасць заяўнікаў будзе правярацца ў адпаведнасці з крытэрыямі, выкладзенымі ў Раздзеле 2.1.1.

Дэкларацыя асноўнага заяўніка будзе зверана з пацвярджальнымі дакументамі, прадстаўленымі заяўнікам(-і). Любы адсутны пацвярджальны дакумент або любая неадпаведнасць паміж дэкларацыяй заяўніка і пацвярджальнымі дакументамі можа прывесці да адмовы праектнай прапанове толькі на гэтай падставе.

Любая адхіленая праектная прапанова будзе заменена наступнай праектнай прапановай у рэзервовым спісе, якая ўваходзіць у бюджэт, зарэзерваваны для гэтага лота і этапу конкурсу прапаноў.

## 6. ПАДРЫХТОЎКА ДА ЗАКЛЮЧЭННЯ КАНТРАКТА

Грант-менеджары праграмы праінфармуюць заяўнікаў, чые прапановы былі папярэдне адабраны, пра неабходныя выпраўленні і дапрацоўкі, заснаваныя на каментарыях экспертаў і рэкамендацыях Адборачнай камісіі, і пра тэрміны падачы такіх выпраўленняў.

У выпадку, калі неабходныя выпраўленні, тлумачэнні і абгрунтаванні не будуць пададзены ў тэрмін, праектная прапанова можа быць адхілена і заменена наступнай з рэзервовага спіса.

**Для мэт складання кантракта заяўніку будзе прапанавана падаць наступныя дакументы:**

1. Скан пасведчання аб рэгістрацыі арганізацыі *(для юрыдычных асоб)* і скан статута або мемарандум аб стварэнні ініцыятывы *(для фізічных асоб з ініцыятывы)*;

2. Кантактныя дадзеныя арганізацыі *(адрас, тэлефон, электронная пошта)*;

3. Банкаўскія рэквізіты арганізацыі для атрымання грашовых сродкаў у еўра *(імя ўладальніка рахунку, назва банка, адрас банка, IBAN, SWIFT)*;

4. Пратакол пасяджэння кіраўнічага органа аб прызначэнні:

   a) Кіраўніка (менеджара) праекта;

   b) Упаўнаважанага прадстаўніка арганізацыі для падпісання кантракта з адказным партнёрам Belarus Beehive;

5. Кантактная інфармацыя (адрас, тэлефон, электронная пошта кіраўніка праекта і прадстаўніка арганізацыі);

6. Самаацэнка заяўнікаў, сузаяўнікаў і афіляваных арганізацый адносна іх унутранай палітыкі і працэдур супраць сексуальнай эксплуатацыі, гвалту і дамаганняў (SEA-H);

7. Чэк-ліст унутранага кантролю арганізацыі/ініцыятывы.

Калі пералічаныя вышэй дакументы не будуць пададзены да заканчэння тэрміну, указанага ў запыце, накіраваным заяўніку супрацоўнікам праграмы Belarus Beehive, праектная прапанова можа быць адхілена.

Любая адхіленая прапанова будзе заменена наступнай найлепшай у рэзервовым спісе, якая ўваходзіць у даступны бюджэт для гэтага конкурсу прапаноў.

Пасля падачы ўсіх запытаных выпраўленняў і неабходных дакументаў атрымальніку будзе прапанаваны кантракт аб гранце. Да кантракта будуць дададзены праектная прапанова і бюджэт, а таксама доступ да аўтаматызаванай сістэмы справаздачнасці. У ім будуць вызначаны тэрміны справаздач, выплат і колькасць траншаў. Колькасць і памер траншаў будуць вызначаны ў залежнасці ад працягласці праекта і сумы фінансавання.

**Беларускія арганізацыі** (ініцыятывы) грамадзянскай супольнасці, **якія дзейнічаюць у Беларусі**, могуць рэалізоўваць свае праекты паводле кантрактаў на аснове вынікаў *(Output Based Contracts)*, калі іх бюджэт не перавышае *10 тыс. еўра*. Магчымасць рэалізацыі праекта паводле такога кантракта будзе вызначацца ў кожным канкрэтным выпадку.

Пасля падпісання кантракта з кожным атрымальнікам гранта будуць праведзены індывідуальныя ўступныя сустрэчы для тлумачэння патрабаванняў да рэалізацыі і справаздачнасці, узгаднення каналаў сувязі і г. д.

## 7. СПІС ДАДАТКАЎ (ДАСТУПНЫЯ Ў ВЭБ-АПЛІКАЦЫІ BEESYSTEM)

Дакументы, якія трэба запоўніць:

1. **Дадатак A:** Дэкларацыя заяўніка
2. **Дадатак B:** Мандат сузаяўніка (калі ёсць)
3. **Дадатак C (толькі для Лотаў 2 і 3):** Ацэнка (дыягностыка) арганізацыйнага патэнцыялу АГС

## 8. АЦЭНКА (ДЫЯГНОСТЫКА) АРГАНІЗАЦЫЙНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ АГС

**Увага!**

*Для Лотаў 2 і 3 заяўнікі, каб быць кваліфікаванымі для падачы праектнай прапановы, мусяць прыкласці дакумент з Ацэнкай (дыягностыкай) арганізацыйнага патэнцыялу, распрацаванага з дапамогай знешняга кансультанта на працягу апошніх 12 месяцаў да заканчэння тэрміну прыёму праектных прапаноў. У гэтым дакуменце мусіць быць пазначана аўтарства эксперта, які праводзіў ацэнку. У гэтай ацэнцы мусяць быць адлюстраваны наступныя характарыстыкі арганізацыі: стратэгічны менеджмент; выніковасць і грамадская карыснасць; праектна-праграмная дзейнасць; структура і інфраструктура, сістэма кіравання; пазіцыянаванне, сеткавае і міжсектаральнае ўзаемадзеянне.*

Для таго, каб Ацэнка арганізацыйнага патэнцыялу, зробленая арганізацыяй з незалежным кансультантам паводле ўласнай замовы, была прынята

праграмай Belarus Beehive, патрабуецца, каб яна была актуальнай для арганізацыі і не старэйшай за 12 месяцаў на момант удзелу ў конкурсе. Таксама мусіць быць пазначана аўтарства ацэнкі і кантакты кансультанта для верыфікацыі.

Заяўнікі могуць запытаць у праграмы Belarus Beehive кансультанта для дапамогі ў правядзенні арганізацыйнай ацэнкі (дыягностыкі) і стварэння адпаведнага дакумента. У гэтым выпадку вы мусіце накіраваць на пошту **consulting.beehive@proton.me** ліст з наступнай інфармацыяй:

– назва арганізацыі, кароткая інфармацыя пра яе, кантакты;
– пры наяўнасці – спасылкі на вэб-сайт і сацыяльныя сеткі арганізацыі;
– узрост арганізацыі і прыкладная колькасць супрацоўнікаў, сябраў;
– коратка паведаміць, якія мерапрыемствы, дзеянні, меры робіць арганізацыя **ў дачыненні да Беларусі ці беларусаў у Беларусі.**

Кансультанты даюцца праграмай Belarus Beehive **толькі арганізацыям, якія адказваюць крытэрыям прымальнасці** (гл. Раздзел 2.1 для Лотаў 2, 3), у парадку чаргі і да вычарпання выдзеленых на гэта рэсурсаў. Для таго, каб паспець з правядзеннем дыягностыкі, арганізацыі павінны звярнуцца не пазней чым за месяц да заканчэння тэрміну падачы праектных прапаноў.

**Арганізацыі можа быць адмоўлена** ў прадастаўленні паслугі правядзення ацэнкі (дыягностыкі) арганізацыйнага патэнцыялу па наступных прычынах:

- Арганізацыя/ініцыятыва дзейнічае менш за год;
- Дзейнасць арганізацыі/ініцыятывы не суадносіцца з мэтамі конкурсу;
- Арганізацыя/ініцыятыва не ажыццяўляе дзейнасць на працягу апошняга паўгоддзя;
- Арганізацыя/ініцыятыва займаецца выключна вытворчасцю медыякантэнту або арганізацыяй вольнага часу дзяцей і дарослых праз культурныя ці спартыўныя мерапрыемствы;
- Дзейнасць арганізацыі/ініцыятывы накіраваная выключна на падтрымку дыяспары;
- Арганізацыя/ініцыятыва з'яўляецца аддзелам або часткай іншай арганізацыі;
- Арганізацыя/ініцыятыва складаецца з не больш чым 1-3 чалавек або з круга людзей, якія з’яўляюцца членамі адной сям’і ці сваякамі.

## Corrigendum No 1 да п.1.6 Палажэння аб конкурсах праектных прапаноў ад праграмы Belarus Beehive 2.0

Праектныя прапановы, якія перамогуць у конкурсе з дэдлайнам 16 мая 2025 г. і атрымаюць падтрымку, змогуць распачаць дзейнасць па праекце і падпісаць кантракт **не раней за 15 верасня 2025 г**. Пры гэтым дзейнасць па праекце павінна быць завершана **не пазней за 31 сакавіка 2026 г.**